

**Надзея ПАРЧУК**

## Забег у госці лістапад

*Азалаціўся ў садзе абрыкос —*
*Яго так восень шчодра адарыла*
*За тое, што выдатна службу нёс,*
*Не шкадаваў пладам уласнай сілы.*

*Вясною ранняй першым расквітнеў,*
*Хаця было занадта рызыкоўна,*
*Ды што яму вятроў суровы гнеў,*
*Калі свяціла сонейка чароўна.*

*У летні час прахожых захапляў*
*Раскошнай кронай, шумнаю лістотай*
*І час ад часу спелы плод кідаў —*
*З такой прывабнай дзіўнай пазалотай.*

*А сёння зноў палоніць позірк наш —*
*На развітанне з шыкам увабраўся!*
*Ды лістапад усю сарве гуаш,*
*Калі па праве ў сад ужо ўварваўся.*

## Восеньская замалёўка

*Зноў лістапад сарваў тваю адзежу,*
*Па белым свеце золата разнёс,*
*Ды я цябе вясной наступнай цешу,*
*Счарнелы мой, самотны абрыкос.*

*Яна да нас абавязкова прыйдзе.*
*Ты толькі вер і стойкім будзь, прашу.*
*Міне зіма, раненька сонца ўзыдзе,*
*Тваю й маю абрадуе душу…*

* * *

У вянок Яўгеніі Янішчыц

*Шкада, што цябе ўжо няма*
*сярод нас,*
*Ды ў думках і сэрцах ёсць нашых.*
*Твой дзесьці ў нябёсах*
*пасецца Пегас,*
*Сілкуецца роснаю пашай.*

*Бывае, пад неба ўзвіваецца ён*
*На крылах любові і жалю*
*І, бы непрыкаяны белы анёл,*
*За воблачнай носіцца даллю.*

*Гукае, шукае ўладарку сваю,*
*Ды так і нідзе не знаходзіць,*
*І ціха спускаецца зноў на зямлю,*
*Да вёсачкі Рудкі падходзіць…*

*Шкада, што цябе ўжо няма сярод нас,*
*Ды ў думках і сэрцах ты з намі.*
*Хай лета ці восень,*
*вясна ці зіма —*
*Прыходзіш сваімі радкамі.*

## Не за гарамі Новы год

*Зіма… Палеская зіма*
*То снегам сыпле, то дажджамі.*
*А дні ляцяць, і нездарма*
*Ўжо Новы год не за гарамі.*

*Ён на парозе зноў стаіць,*
*Падворак, мабыць, аглядае.*
*«Ці можна мне ў вас пагасціць?» —*
*Дазволу хутка запытае…*

*І мы рыхтуемся да свят,*
*Нібы да казачнага дзіва,*
*Бо ў нас здаўна такі абрад:*
*Вітацца з госцейкам зычліва.*

*А Новы год і праўда госць —*
*Доўгачаканы і адметны.*
*Ён дорыць людзям весялосць*
*І не шкадуе мараў светлых.*

*Дык з надыходзячым, сябры!*
*Няхай заўсёды вам шанцуе!*
*Хай снегам поўняцца двары,*
*А ўлетку сонейка шчыруе!*